ISSN 0321-1649 (print)
УДК УДК 94(476–15)+94(438)

Паступіў у рэдакцыю 08.12.2015
Received 08.12.2015

**В. І. Крывуць**

*Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт, Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

# ПАЛІТЫКА ПОЛЬСКІХ УЛАД ПА ВАЕННАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ МОЛАДЗІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.)

Анализируется такая малоизученная в отечественной историографии проблема, как военно-подготовительная работа польских властей в молодежной среде Западной Беларуси в межвоенный период. Характеризуются основные задачи и направления деятельности по привлечению общества к усилению обороноспособности польского государства, а также особенности проведения этой акции на территории западнобелорусского региона. Оценивается роль общественных и государственных структур, в первую очередь молодежных военизированных организаций, армии и системы образования в осуществлении военной подготовки (ВП) молодого поколения. Подчеркивается, что деятельность в данной сфере особенно активизировалась после установления в польском государстве «санационного» режима во главе с маршалом Ю. Пилсудским, который был инициатором создания строго централизованной системы акции ВП. Польские власти помимо непосредственно военного обучения подрастающего поколения ставили перед собой задачу и его гражданско-патриотического воспитания, которое в условиях Западной Беларуси носило ярко выраженный полонизаторский характер. Отдельно анализируются основные препятствия, мешавшие эффективной реализации военной подготовки молодежи западнобелорусского региона, – в первую очередь его социально-экономическая отсталость и враждебность значительной части местного населения по отношению к любым мероприятиям польских властей. Используются различные документальные и историографические источники.

*Ключевые слова:* военная подготовка, молодежь, молодежная политика, Западная Беларусь, «санация».

**V. I. Krivuts**

*baranovichi State University, Baranovichi, Republic of Belarus*

## THE POLISH AUTHORITIES' POLICY ON MILITARY TRAINING FOR YOUNG PEOPLE IN WESTERN BELARUS (1921–1939)

The article explores an issue which has so far received little attention in Belarusian historiography, i.e. military preparations by the Polish authorities among Western Belarusian youth in the Interwar Period. Main objectives and areas of activities to involve the society in strengthening the defence capacity of the Polish state and specifics of these activities in Western Belarus are described. The role which public and governmental structures, first of all, militarized youth organizations, the army and education system played in military training (MT) for the young generation is evaluated. It is noted that these activities particularly intensified after the Sanation regime was established in the Polish state. It was headed by Marshal J. Pilsudski who initiated a rigidly centralized MT system. Besides ensuring military training for the younger generation, Polish authorities tasked themselves with educating it in terms of loyalty and patriotism. In the Western Belarusian context, that meant clear-cut polonization. A separate analysis covers main barriers to efficiently implement MT for young people in Western Belarus. These are, first of all, the region's social and economic backwardness, and hostile attitude among the majority of the local population towards any action by Polish authorities. The article uses various documentary and historiographcal sources.

*Keywords*: military training, youth, youth policy, Western Belarus, Sanation.

Галоўнай мэтай афіцыйнай маладзёжнай палітыкі польскіх улад у міжваенны перыяд было абвешчана выхаванне грамадзяніна-дзяржаўніка, байца і працаўніка ў адной асобе. У сувязі з гэтым адным з асноўных кірункаў працы ў маладзёжным асяроддзі, у тым ліку і на тэрыторыі Заходняй Беларусі, стала ваенная падрыхтоўка (ВП) маладога пакалення. На жаль, дадзеная праблематыка не знайшла належнага адлюстравання ў айчыннай гістарыяграфіі. Таму існуе неабходнасць раскрыцця мэт, задач і метадаў ваенна-падрыхтоўчай працы афіцыйных структур міжваеннай польскай дзяржавы сярод заходнебеларускай моладзі, што дазволіць скласці больш аб'ектыўнае ўяўленне аб грамадска-палітычным жыцці Заходняй Беларусі ў 1920–1930 гг.

© Крывуць В. І., 2017

Неабходна адзначыць, што ВП моладзі займала значнае месца ў маладзёжнай палітыцы практычна ўсіх краін міжваеннай Еўропы. Вопыт Першай сусветнай вайны паказваў, што вайна не з'яўляецца справай вузкай вайсковай эліты і арміі. Яшчэ ў 1923 г. адзін з будучых кіраўнікоў «санацыі» А. Коц адзначаў, што мэтанакіраваная падрыхтоўка ўсяго грамадства да вырашэння задач па абароне краіны мае рашаючае значэнне для вынікаў вайны. Ён называў падрыхтоўку рэзерваў фактарам нацыянальнай сілы. На думку А. Коца, падрыхтоўка рэзерваў павінна была ахопліваць і моладзь [1, с. 70]. Акрамя таго, польскія вайсковыя колы ўлічвалі геапалітычнае і фінансавае становішча сваёй краіны. Так, Р. Старжыньскі, маёр польскага Генеральнага штаба, адзначаў: «Маючы на захадзе Германію з 60-мільённым насельніцтвам, на ўсходзе – Расію з яе 120 мільёнамі жыхароў, мы будзем мець справу са шматмільённымі арміямі, якім не зможам супрацьпаставіць роўную па сілах рэгулярную армію… Паколькі бюджэтныя магчымасці не дазваляюць утрымліваць моцную рэгулярную армію, мы павінны шукаць іншыя шляхі» [2, с. 59].

Такім іншым шляхам і стала ВП насельніцтва, у першую чаргу моладзі. Пры гэтым у руках ваенных заставаліся агульнае кіраўніцтва і кантроль, а непасрэдная рэалізацыя праграм навучання даручалася грамадскім арганізацыям і школе. Навучанне павінна было засноўвацца на прынцыпе добраахвотнасці. Заняткі праводзіліся як ваеннымі, так і цывільнымі спецыялістамі [3, с. 21–22].

Пры гэтым афіцыйныя дакументы рэкамендавалі пры правядзенні ваенна-падрыхтоўчай працы ўлічваць мясцовыя ўмовы – стратэгічнае становішча мясцовасці, яе этнаграфічны склад і «дзяржаўніцкія пачуцці грамадзян» [3, с. 26]. Польскія ўлады апасаліся, што пры правядзенні ВП моладзі на ўскраінах краіны, у тым ліку і на тэрыторыі заходнебеларускіх ваяводстваў, могуць узнікнуць «афіцыйныя дружыны з нявыгадным нацыянальным складам» [4, с. 13].

У пачатку 1920-х гг. дазвол на правядзенне ВП атрымалі Стралецкі саюз «Стралец», Саюз польскага харцарства (СПХ), «Сокал» і шэраг рэгіянальных арганізацый (у тым ліку віленскае Таварыства абароны крэсаў). Да сярэдзіны 1920-х гг. гэты спіс значна павялічыўся [5, с. 25]. Пры гэтым тагачасныя інструкцыі ваеннага міністэрства прадугледжвалі, што членамі гэтых арганізацый могуць быць выключна палякі. Тыя ж інструкцыі рэкамендавалі ўважліва адносіцца да ўзбраення членаў арганізацый ВП на тэрыторыі памежных акруг польскай дзяржавы [4, с. 126–127].

У снежні 1922 г. было выдадзена сумеснае распараджэнне міністра асветы і міністра ваенных спраў аб арганізацыі ВП у сярэдніх і прафесійных школах. Згодна з ім у школах уводзіліся добраахвотныя заняткі ваеннай падрыхтоўкі, якія праходзілі ў спецыяльна створаных дзеля гэтага школьных атрадах (гуфцах) [6, с. 2–5].

На першапачатковым этапе вайсковыя колы былі незадаволены развіццём акцыі ВП. Так, напрыклад, яны абвінавачвалі грамадскія арганізацыі ў празмернай палітызацыі ваеннага навучання, нездаровай канкурэнцыі і «арганізацыйным хаосе» [7, с. 118]. Прадстаўнікі польскага Генеральнага штаба адзначалі ў 1925 г., што ВП ахоплівае толькі 7% прызыўнікоў (без уліку школьнікаў). Пры гэтым толькі 9% членаў арганізацый ВП прыпадалі на ўсходнія ваяводствы [3, с. 42].

Сітуацыя ў сферы ВП пачала кардынальна мяняцца пасля майскага дзяржаўнага перавароту 1926 г. Польскі дыктатар Ю. Пілсудскі з'яўляўся гарачым прыхільнікам дадзенай акцыі. Маршал лічыў, што галоўную ролю ў развіцці ваеннай падрыхтоўкі павінны адыгрываць школа, армія і іншыя дзяржаўныя інстытуты. Дапаможныя функцыі ён адводзіў мясцоваму самакіраванню, грамадскім і спартыўным арганізацыям [8, с. 108].

У студзені 1927 г. па ініцыятыве Ю. Пілсудскага было створана Дзяржаўнае ўпраўленне фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі, якое стала асновай для стварэння новага кіруючага апарату акцыі ВП. Менавіта гэтая ўстанова размяркоўвала бюджэтныя сродкі, якія выдзяляліся на развіццё ВП. Адначасова прадугледжвалася стварэнне адпаведных камітэтаў у ваяводствах, паветах і гарадах [9, с. 82–84]. Паралельна пры штабах вайсковых акруг ствараліся акруговыя ўпраўленні ВП. Ніжэй, на ўзроўні палка, стаялі абвадовыя камендатуры і, нарэшце, павятовыя камендатуры ВП. Менавіта каменданты апошніх адказвалі за правядзенне заняткаў у школьных атрадах і ўзаемадзеянне з грамадскімі арганізацыямі [3, с. 75].

Ужо на мяжы 1920–1930-х гг. адбыўся пэўны зрух у масавасці ВП. Калі ў 1929 г. ваенную падрыхтоўку прайшлі 57,7% прызыўнікоў і рэзервістаў, то ў 1930 г. гэтая лічба склала 71,5%.

Неабходна адзначыць, што на тэрыторыі Заходняй Беларусі гэты працэнт быў нават вышэйшы. Так, у акрузе № 3 «Гродна» ВП ахапіла адпаведна 64,8% (1929 г.) і 82,2% (1930 г.), а ў акрузе № 9 «Брэст» – 55,5% (1929 г.) і 79,3% (1930 г.) прызыўнікоў і рэзервістаў [3, с. 96].

Пашырэнню акцыі ВП садзейнічаў шэраг мерапрыемстваў. Паступова заняткі ў школьных атрадах ВП (у тых школах, дзе такія атрады існавалі) сталі абавязковымі. З верасня 1937 г. ваенная падрыхтоўка была абавязковым прадметам для ўсіх школьнікаў, пачынаючы з 15 гадоў [10, с. 439–440].

У параўнанні з 1921 г. значна скарацілася колькасць грамадскіх арганізацый, якія мелі права праводзіць ВП і атрымліваць падтрымку з боку ваеннага міністэрства. З 1931 г. гэта былі толькі Стралецкі саюз «Стралец», СПХ і Саюз сельскай моладзі «Сеў» [3, с. 87]. Усе гэтыя аб’яднанні знаходзіліся пад уплывам «санацыі».

Вялікі ўплыў на развіццё ВП зрабіла сістэма льгот. Рэкрут, які прайшоў ВП, меў права на скарачэнне тэрміновай вайсковай службы на 4–6 тыдняў. Таксама яго ў першую чаргу накіроўвалі ў падафіцэрскую школу, паскорана прысвойвалі званне капрала [11, с. 912–914].

Значная ўвага надавалася і маральнаму фактару. У сувязі з гэтым акрамя непасрэдна ваеннага навучання праводзілася значная праца па грамадзянскім і патрыятычным выхаванні. Кіруючыя колы польскай дзяржавы лічылі, што маральная падрыхтоўка з’яўляецца неабходным элементам падрыхтоўкі грамадства да вайны. Так, у дырэктывах па ВП на 1936/37 навучальны год адзначалася: «Незалежна ад ваенных задач у якасці найбольш актуальнай задачы ўзнімаецца пытанне грамадзянскага выхавання і прапаганды лозунгаў нацыянальнай абароны, як падрыхтоўкі моладзі да выканання задач па абароне краіны» [12, с. 11]. Ва ўмовах Заходняй Беларусі грамадзянскае выхаванне прадугледжвала ў першую чаргу паланізацыю мясцовай моладзі, якую «санацыйныя» ўлады пачалі актыўна ўцягваць у свае арганізацыі. Зразумела, без адпаведнай ідэйна-выхаваўчай апрацоўкі яны не маглі даверыць зброю маладым беларусам. Тым больш, што «санацыя» імкнулася распаўсюджваць ВП не толькі на мясцовых палякаў, як гэта было прадугледжана інструкцыямі 1921 г.

Была распрацавана даволі падрабязная праграма ВП. Яна была падзелена на некалькі раздзелаў: фізічнае выхаванне, стралковае навучанне, баявая падрыхтоўка, служба (муштра). Раздзел фізічнай падрыхтоўкі прадугледжваў маршы, бег, элементы фехтавання, спартыўныя гульні (футбол, баскетбол), лёгкую атлетыку, плаванне. Другая частка праграмы – стралковае навучанне – уключала вывучэнне зброі і навучанне стралковай справе [13, с. 7–9].

Баявая падрыхтоўка прысвячалася вывучэнню элементаў тактыкі. Раздзел «Служба» ўключаў такія падраздзелы, як страявая падрыхтоўка, арганізацыя ўзброеных сіл, унутраная служба (вывучэнне армейскіх статутаў), салдацкія якасці, веды пра сучасную Польшчу, захоўванне ваеннай тайны [14, с. 2].

Як правіла, заняткі па ВП праводзіліся рэгулярна, адзін-два разы на тыдзень. Усё навучанне дзялілася на дзве ступені: школа малодшых і школа старэйшых юнакоў. Навучанне завяршалася ў летніх лагерах (толькі для школы старэйшых юнакоў). Менавіта ў лагерах праводзіліся заключныя экзамены, мэтай якіх было выяўленне ступені падрыхтаванасці юнакоў. У выпадку паспяховай здачы экзаменаў юнак атрымліваў адпаведнае пасведчанне. Умовы атрымання гэтага пасведчання прадугледжвалі: завяршэнне першай ступені ВП, поўны год працы ў атрадзе старэйшых юнакоў, атрыманне «Польскай спартыўнай адзнакі», праходжанне маршаў і стрэльбаў, заплыў (25 м вольным стылем), дастатковае авалоданне прадметамі навучання [15, арк. 28].

Неабходна адзначыць, што некаторыя прадстаўнікі Войску Польскага даволі крытычна адносіліся да ўзроўню ВП у грамадскіх арганізацыях. Прапанавалася нават пазбавіць іх ільгот, у першую чаргу скарачэння тэрміну вайсковай службы. Падкрэслівалася, што аб’ём навучання другой ступені ВП у грамадскіх арганізацыях значна меншы, чым аб’ём навучання рэкрута непасрэдна ў палку [16, с. 683–684].

Не заўсёды добра праводзілася ВП у школах. Вайсковыя інструктары былі не падрыхтаваны да педагагічнай і выхаваўчай працы са школьнікамі. Гэта выклікала канфлікты паміж ваеннымі і школьным кіраўніцтвам. Так, у 1937 г. кіраўніцтва Віленскай гімназіі айцоў езуітаў звярнулася да камандавання 5-га пяхотнага палка легіёнаў, пад апекай якога знаходзіўся школьны атрад ВП,

з просьбай памяняць інструктараў, паколькі тыя выкарыстоўваюць «неадпаведныя выхаваўчыя метады» – абражаюць падлеткаў, выкарыстоўваюць ненарматыўную лексіку, негатыўна выказваюцца ў адносінах да ордэна езуітаў. Ваенныя ўлады задаволілі гэтую просьбу. І ўжо летам 1937 г. школьнае кіраўніцтва прызнавала, што новыя інструктары «адрозніваюцца выключнымі якасцямі з маральнага, педагагічнага і прафесійнага пункта гледжання» [17, с. 222].

Аднак на тэрыторыі Заходняй Беларусі галоўнай перашкодай на шляху нармальнага развіцця акцыі ВП была не толькі адсутнасць рацыянальна распрацаваных праграм і адпаведна падрыхтаваных інструктарскіх кадраў. Галоўнай перашкодай з'яўлялася негатыўнае ці ў лепшым выпадку абыякавае стаўленне значнай часткі насельніцтва. Слабае развіццё камунікацый і цяжкае матэрыяльнае становішча мясцовых жыхароў таксама адыгрывалі сваю ролю.

Гэта можна прасачыць на прыкладзе справаздач камітэтаў ВП 9-й акругі карпусоў Войску Польскага. Так, у 1927 г. пра развіццё ВП на тэрыторыі Баранавіцкага, Навагрудскага і Нясвіжскага паветаў (раён адказнасці 78-га пяхотнага палка) паведамлялася: «З арганізацыйнага пункта гледжання рэгіён развіты слаба. Вялікая плошча, слабыя шляхі зносін і малыя сродкі не дазваляюць лепшага развіцця. Да працы ў ВП больш імкнецца гарадскі элемент, вёска слаба разумее яе значэнне, выключэнне складаюць толькі асаднікі, а з прызыўнікоў і рэзервістаў толькі тыя, хто з'яўляюцца членамі аб'яднанняў». У Слонімскім павеце (раён 79-га пяхотнага палка) адзначалі: «З гарадскога элемента больш усяго схільная да працы ВП школьная моладзь. З пазашкольнай моладзі толькі адзінкі ўцягнуты ў Стралецкі саюз. Вясковая моладзь вельмі мала прысвячае сябе працы ВП». У Косаўскім і Пружанскім паветах (раён 80-га пяхотнага палка) падкрэслівалі: «Умовы для ВП неспрыяльныя па прычыне дрэнных камунікацый, нязручнага размяшчэння вайсковых часцей і нядобразычлівых адносін да ВП асноўнай часткі нацыянальных меншасцей» [18, арк. 57].

Мясцовыя ўлады скардзіліся, што насельніцтва не разумее неабходнасці ВП. На іх думку, у Пінскім, Лунінецкім і Столінскім паветах (раён 84-га пяхотнага палка) працы перашкаджае адсутнасць разумення ідэі ВП. Акрамя таго, «сельская моладзь з'яўляецца беларускай і не мае ахвоты да ваенных заняткаў, да працы па ВП яе можна прыцягнуць толькі праз арганізацыю спорту і гульняў» [19, арк. 59].

Як вядома, нацыянальныя меншасці міжваеннай Польшчы даволі насцярожана і нават варожа ставіліся да існуючай дзяржавы і яе структур, у тым ліку і да арміі. Аб гэтым, напрыклад, сведчаць справаздачы ваеннага міністэрства за 1934 г. Яны адзначалі, што на этнічна польскіх тэрыторыях «адчуваецца праца адміністрацыйных улад у кірунку тлумачэння грамадзянам таго, чым з'яўляецца армія і як належыць да яе ставіцца». Адначасова ў мясцовасцях, дзе пражываюць славянскія меншасці, здараюцца «правакацыі скамунізаванай беларускай моладзі, знявагі салдат, адмаўленні выдзеліць кватэры і нават крадзеж зброі» [20, с. 66].

Зразумела, што ў такіх умовах акцыя ВП, ініцыятарам і кіраўніком якой з'яўлялася армія, не сустракала дастатковай падтрымкі. Такая сітуацыя не магла задаволіць «санацыйны» рэжым. Змяніць становішча, на думку ўлад, павінна было адпаведнае грамадзянскае выхаванне маладога пакалення. Асаблівую актыўнасць у дадзеным кірунку выяўляў Стралецкі саюз. У адпаведнасці з інструкцыяй, распрацаванай віленскім кіраўніцтвам «Стральца», мэтай гэтага выхавання было «даць усебаковае ўяўленне пра Айчыну, аформіць дзяржаўны інстынкт, прывучыць да дысцыпліны і падпарадкавання ўладам, развіць пачуццё патрыятызму і адданасці традыцыям, сфарміраваць моцныя характары» [21, арк. 117]. Аднак, як паказалі падзеі верасня 1939 г., рэалізаваць дадзеныя пастулаты ў поўным маштабе польскія ўлады не здолелі.

Такім чынам, неабходна прызнаць, што ў міжваеннай польскай дзяржаве, у тым ліку і на тэрыторыі Заходняй Беларусі, праводзілася значная праца па рэалізацыі ваеннай падрыхтоўкі маладога пакалення. Мэтамі гэтай падрыхтоўкі з'яўляліся павышэнне абароназдольнасці дзяржавы і, адначасова, патрыятычнае выхаванне моладзі ў духу вернасці існуючаму рэжыму. Асаблівая праца па ВП актывізавалася пасля 1926 г. У яе рэалізацыі прымалі ўдзел як дзяржаўныя структуры, у першую чаргу армія і школа, так і грамадскія арганізацыі. Як вядома, намаганні афіцыйных улад і грамадскасці не змаглі ў далейшым прадухіліць ліквідацыю польскай дзяржаўнасці. Аднак яны зрабілі пэўны ўплыў на моладзь. Але гэты ўплыў неабходна па-рознаму ацэньваць

на этнічна польскіх тэрыторыях Польшчы і на тэрыторыі яе ўсходніх ваяводстваў. Фактычна, у Заходняй Беларусі акцыя ВП была накіравана на паланізацыю мясцовай моладзі і сустракала значныя перашкоды, якія былі выкліканы не толькі складанымі сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі, але і негатыўнымі адносінамі значнай часткі насельніцтва.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Koc, A. Przysposobienie wojskowe poza ramami wojska / A. Koc // Wychowanie wojskowe. Praca zbiorowa. – Warszawa: Wojskowy instytut naukowo-wydawniczy, 1923. – S. 67–79.

2. Starzyński, R. Przysposobienie wojskowe narodu pod bronią / R. Starzyński // Bellona. – 1927. – T. XXV – S. 42–59.

3. Kęsik, J. Naród pod bronią. Społeczeństwo w programie polskiej polityki wojskowej 1918 – 1939 / J. Kęsik. – Wrocław: Wydawnictwo Uniwersytetu Wrocławskiego, 1998. – 200 s.

4. Wojtycza, J. Studia i materiały z dziejów Przysposobienia Wojskowego w Polsce w latach 1918–1926 / J. Wojtycza. – Kraków: Wydawnictwo Naukowe Akademii Pedagogicznej, 2001. – 214 s.

5. Wywiał, P. Związek Strzelecki w tworzeniu bezpieczeństwa narodowego Polski. Tradycja i wyzwania XXI wieku / P. Wywiał. – Łodź, 2009. – 175 s.

6. Rozporządzenie Ministra Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego i Ministra Spraw Wojskowych w sprawie Organizacji Przysposobienia Wojskowego w Szkolach Średnich i Zawodowych // Dziennik Urzędowy Ministerstwa Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego. – 1923. – № 1. – S. 2–5.

7. Kiliński, W. Wpływ Państwa na organizację i rozwój wychowania fizycznego i przysposobienia wojskowego / W. Kiliński // Zrąb. – 1931. – T. 6 – 7. – S. 117 – 128.

8. Jabłonowski, M. Wychowanie fizyczne i przysposobienie wojskowe w opiniach Józefa Piłsudskiego 1926–1935 (wybrane zagadnienia) / M. Jabłonowski // Echa Przeszłości VI. – Olsztyn, 2005. – S. 107–118.

9. Rozporządzenie Rady Ministrów z dnia 28 stycznia 1927 r. w sprawie utworzenia Panstwowego Urzędu Wychowania Fizycznego i Przysposobienia Wojskowego // Dziennik Urzędowy Ministerstwa Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego. – 1927. – № 3. – S. 82–85.

10. Zarządzenie Ministra Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego oraz Ministra Spraw Wojskowych z dnia 10 września 1937 r. w sprawie organizacji przysposobienia młodzieży szkolnej do oborony kraju // Dziennik Urzędowy Ministerstwa Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego. – 1937. – № 12. – S. 439–441.

11. Rozporządzenie Ministra Spraw Wojskowych z dnia 29 czerwca 1935 r. w sprawie ulg w wykonywaniu obowiązku służby wojskowej dla członków organizacji przysposobienia wojskowego // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej. – 1935. – № 54. – S. 912–917.

12. Kaszuba, E. Sistem propagandy państwowej II Rzeczypospolitej (1926–1939) / E. Kaszyba // Dzieje Najnowsze. – 2003. – № 3. – S. 3–26.

13. Tymczasowy program przysposobienia wojskowego w szkolach średnich, zawodowych i seminarjach nauczycielskich // Dziennik Urzędowy Ministerstwa Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego. – 1923. – № 1. – S. 7–9.

14. Szkoła Junaka. Podręcznik instruktora Przysposobienia Wojskowego. Służba. – Warzawa: Głowna Księgarnia Wojskowa, 1935. – 470 s.

15. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Ф. 67 сч. Воп. 2. Спр. 197.

16. Latawiec, C. Praca w Przysposobieniu Wojskowem u dołu / C. Latawiec // Przegląd piechoty. – 1933. – № 5. – S. 681 – 685.

17. Gimnazjum Ojców Jezuitów w Wilnie w latach 1922–1940 (monografia) / Red.: R. Cybulski, A. Houwalt, J. Jasienski. – Bydgoszcz, 1999. – 522 s.

18. Палескае ваяводскае ўпраўленне // ДАБВ. – Ф. 1. Воп. 2. Спр. 2402.

19. Камандаванне акругі корпуса № 9 // ДАБВ. – Ф. 67 сч. Воп. 2. Спр. 1052.

20. Lossowski, P. Społeczeństwo polskie a wojsko w okresie I wojny światowej i II Rzeczypospolitej / P. Lossowski // Dzieje Najnowsze. – 1983. – № 3. – S. 57–71.

21. Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 242 п. Воп. 1. Спр. 465.


## References


1. Koc, A. (1923), "Military Training outside the Framework of the Military", *Wychowanie wojskowe. Praca zbiorowa* [Military Education. Group work]. Warszawa, PL, pp. 67–79.

2. Starzyński, R. (1927), "Military Training of the Nation under Arms", *Bellona* [Bellona], no. XXV, pp. 42–59.

3. Kęsik, J. (1998), *Naród pod bronią. Społeczeństwo w programie polskiej polityki wojskowej 1918–1939* [A Nation under Arms. Society in the Polish Military Policy in 1918–1939], Wrocław, Pl.

4. Wojtycza, J. (2001), *Studia i materiały z dziejów Przysposobienia Wojskowego w Polsce w latach 1918–1926* [Studies and Materials on the History of Military Training in Poland in 1918–1926], Kraków, PL.

5. Wywiał, P. (2009), *Związek Strzelecki w tworzeniu bezpieczeństwa narodowego Polski. Tradycja i wyzwania XXI wieku* [Shooting Association in Establishing Polish National Security. Tradition and Challenges of the Twenty-First Century], Łodź, Pl.

6. (1923), "Regulation of the Minister of Religion and Public Education and the Minister of Military Affairs on the Organization of Military Training in Secondary and Vocational Schools", *Dziennik Urzędowy Ministerstwa Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego* [Official Journal of the Ministry of Religion and Public Education], no. 1, pp. 2–5.

7. Kiliński, W. (1931), "State Influence on the Organization and Development of Physical Education and Military Training", *Zrąb* [Framework], no. 6–7, pp. 117–128.

8. "Physical Education and Military Training as Opined by Jozef Pilsudski in 1926–1935 (Selected Issues)", *Echa Przeszłości VI* [Echoes of the Past VI], Olsztyn, Pl, pp. 107–118.

9. (1927), "Resolution of the Council of Ministers of 28 January 1927 on the Establishment of the State Office of Physical Education and Military Training", *Dziennik Urzędowy Ministerstwa Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego* [Official Journal of the Ministry of Religion and Public Education], no. 3, pp. 82–85.

10. (1937), "Order of the Minister of Religion and Public Education and the Minister of Military Affairs of 10 September 1937 on Organizating Preparation of Schoolchildren to Defend the Country", *Dziennik Urzędowy Ministerstwa Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego* [Official Journal of the Ministry of Religion and Public Education], no. 12, pp. 439–441.

11. (1935), "Regulation of the Minister of Military Affairs dated 29 June 1935 on Exempting Persons Participating in the Organization of Military Training from Mandatory Military Service", *Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej* [Journal of Laws of the Polish Republic], no. 54, pp. 912–917.

12. Kaszuba, E. (2003), "The State Propaganda System in the Second Republic (1926–1939)", *Dzieje Najnowsze* [Modern History], no. 3, pp. 3–26.

13. (1923), "Provisional Program of Military Training in Secondary and Vocational Schools and in Teacher Training Seminaries", *Dziennik Urzędowy Ministerstwa Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego* [Official Journal of the Ministry of Religion and Public Education], no. 1, pp. 7–9.

14. (1935), *Szkoła Junaka. Podręcznik instruktora Przysposobienia Wojskowego. Służba* [Youngster's School. Military Training Instructor Manual. Service], Warzawa, Pl.

15. *Gosudarstwennyj arkhiv Brestskoj oblasti (GABO)* [State Archives of Brest Region (SABR)], F. 67, sch. L. 2, C. 197.

16. Latawiec, C. (1933), "Field Work in Military Training. Infantry Overview", *Przegląd piechoty*, no. 5, pp. 681–685.

17. *Gimnazjum Ojców Jezuitów w Wilnie w latach 1922–1940 (monografia)* [Jesuit Gymnasium in Vilnius in 1922–1940 (Monograph)], Bydgoszcz, Pl.

18. *GABO* [SABR], F. 1, L. 2, C. 2402.

19. *GABO* [SABR], F. 67, sch. L. 2, C. 1052.

20. Lossowski, P. (1983), "Polish Society and the Army during World War I and the Second Republic", *Dzieje Najnowsze* [Modern History], no. 3, pp. 57–71.

21. *Natsional'nyj archive Respubliki Belarus' (NARB)* [National Archive of the Republic of Belarus (NARB)], F. 242, p. L. 1, C. 39.

## Информация об авторе

*Кривуть Виталий Иванович* – канд. ист. наук, доцент. УО «Барановичский государственный университет» (ул. Парковая, 62, 225320, Минск, Республика Беларусь). E-mail : krivut@mail.ru.

## Information about the author

*Krivuts Vitali Ivanovich,* Ph. D. (Hist.), Assistant Professor, Baranovichi State University (62 Parkovaya Str., Baranovichi 225320, Brest Oblast, Belarus). E-mail: krivut@mail.ru.

## Для цитирования

Крывуць, В. І. Палітыка польскіх улад па ваеннай падрыхтоўцы моладзі Заходняй Беларусі (1921–1939) / В. І. Крывуць // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2017. – № 1. – С. 49–54.

## For citation

Krivuts V. I. The Polish Authorities' Policy on Military Training for Young People in Western Belarus (1921–1939). Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus, humanitarian series, 2017, no. 1, pp. 49–54.